# СПАДЧЫНА ГЕОРГІЯ КАНІСКАГА Ў ЛЁСЕ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН

*Саверчанка І.В.*
*(Мінск, Беларусь)*

Георгій Каніскі (1717–1795) – універсальная асоба эпохі Асветніцтва, буйнейшы ўсходнеславянскі інтэлектуал XVIII ст., выдатны пісьменнік, філосаф, педагог, багаслоў і грамадскі дзеяч. Ён атрымаў бліскучую адукацыю ў Кіеўскай духоўнай акадэміі, авалодаў класічнымі мовамі – лацінскай, старагрэчаскай і стараяўрэйскай, а таксама старабеларускай, польскай і нямецкай.

З 1745 г. Георгій Каніскі настаўнік паэтыкі, а з 1747 г. – прафесар багаслоўя і філасофіі Кіеўскай акадэміі.

30 жніўня 1752 г. Георгій Каніскі стаў рэктарам акадэміі. У 1755 г. ён быў прызначаны Магілёўскім епіскапам і з гэтага часу жыў і тварыў у Магілёве.

Георгій Каніскі – таленавіты пісьменнік і майстар слова. Ён з'яўляецца аўтарам выдатнага ў літаратурных адносінах драматычнага твора "Уваскрэсенне з мёртвых" (1746). Традыцыйны біблейскі сюжэт апрацаваны аўтарам і пададзены ў рэчышчы эстэтыкі Класіцызму. Аднак найбольш каштоўныя ў мастацкім плане – інтэрмедыі, змешчаныя ў творы. Іх героі – простыя людзі – Літвін, Мужык, Шынкарка.

Персанажы інтэрмедый Георгія Каніскага размаўляюць на беларускай мове, выкарыстоўваюць яркія народныя выслоўі, параўнанні, прыказкі і прымаўкі. Напрыклад, Шынкарка, якой няма часу весці пустыя гаворкі, кажа: "Мне некалі носа ўцерці". Другі герой інтэрмедыі – Літвін наогул звяртаецца да народнай варажбы. Ён просіць лясных духаў дапамагчы яму злавіць злачынцу Ляха, які забіў маладога Дзяка: "Лесавыя, баравыя і балотныя, ка мне прыхадзеце // І ў гэтай просьбе вы мне памажыце!" Мужык выказвае гатоўнасць весці злоўленага Ляха на расправу, нібы сабаку: "Учапіўшы путам, павяду як хорта".

Інтэрмедыі Георгія Каніскага маюць выразную антыпольскую скіраванасць. Адмоўныя персанажы ў іх – Лях і Ксёндз. У заключнай частцы Мужык пагражае ляхам. У гневе ён папярэджвае, што прыйдзе час і ўсе польскія паны атрымаюць належнае пакаранне за іх злачынствы: "Дамо вам тут траса".

Пяру Георгія Каніскага належаць каля 80 змястоўных слоў і пропаведзяў, якія ён прамаўляў з царкоўнай кафедры. Бліскучыя ў публіцыстычных

адносінах і глыбока інтэлектуальныя павучанні Георгія Каніскага – арганічны сінтэз хрысціянскай філасофіі і асветніцкага рацыяналізму. Яны скіраваны на выхаванне гуманістычных каштоўнасцей у грамадстве і выразна сведчаць пра імкненне пісьменніка-інтэлектуала да ўсталявання сацыяльнай гармоніі і міру.

Адна з найбольш выбітных пропаведзяў бліскучага аратара: «Слова пры ўступленні на паству». Усведамляючы важнасць уласнай духоўнай місіі, Георгій Каніскі абяцае ў ім аддана служыць беларускаму народу, добрасумленна выконваць пастырскія абавязкі. Ён пісаў: “Вам трубіці пастаўлены я, о набожнае саслоўе беларускае! Як бачу, на мае нешчаслівыя рукі жыццё і кроў ваша пакладзены. І якраз гэтаму ў пачатку вучыць мяне самое імя і тытул чыну майго. Бо слова біскуп – ёсць грэцкае, і на мове той азначае наглядчыка, ахоўніка, стоража. Калі б кожны біскуп называўся сваім айчынным, ясным кожнаму, словам, тады ён, спадзяюся, лепш бы і разумеў і выконваў абавязкі сваёй пасады, якая патрабуе асаблівай пільнасці і выключнага дбання!”

Высокія патрабаванні Георгій Каніскі прад’яўляў, найперш, да самога сябе: “Пасада ў мяне, як вы самі бачыце, ёсць настаўніцкая: а настаўнікі добрыя і не хітрыя перад тым, як вучыць іншых, сябе ў першую чаргу вучаць; свайму вуху, як бліжэйшаму, наперад прапаведуюць, а ўжо затым – чужому! Сваю чысціню наперад захоўваюць, чымся іншых. Але гора таму настаўніку, які, прапаведуе, як Павел кажа, не красці, а сам крадзе”.

Каб перадаць вучням уласныя веды і досвед мастацтва слова, Георгій Каніскі напісаў на лацінскай мове працу: “Правілы паэтычнага мастацтва” (1746). Яна з’яўляецца класічным узорам рыторык і паэтык, якія выкладаліся ў тагачасных навучальных установах.

Пяру Георгія Каніскага належыць бліскучае гістарычнае даследаванне: “Гісторыя русаў або Малай Расіі”, якая была надрукавана толькі ў 1846 г. У працы ўпершыню сістэмна ўзнаўляліся старонкі гісторыі ўкраінскага народа. Пры напісанні “Гісторыі…” Георгій Каніскі карыстаўся пераважна дакументамі і матэрыяламі, якія ён адшукаў у беларускіх архівах і кнігасховішчах. Аб гэтым паведамлялася ва ўступе да выдання: “Взята сія Исторія из летописей и записок Белоруских, яко из страны единоплеменной, соседствующей и от руин Малоросійских удаленной”.

У даследаванні Георгія Каніскага сфармулявана арыгінальная канцэпцыя паходжання славян, асветлены пачатковыя этапы гісторыі славянства. Асаблівы акцэнт ён зрабіў на падзеях агульнага змагання беларусаў, рускіх і ўкраінцаў з мангола-татарскім нашэсцем. Аўтар “Гісторыі…” са скрухай

у сэрцы пісаў пра трагедыю, якая спасцігла ўкраінскі народ падчас нашэсця хана Батыя: "Княствы Малой Рассіі, зведаўшы ад нашэсця Батыя і яго Татараў ў 1240 г. большыя за іншых паразы, па меры моцнага супраціву і кравапралітных бітваў, спустошаны былі дарэшты. Князі іхнія і войскі былі разбітыя; гарады разбураны і спалены, і народ застаўся пад ярмом татарскім, а іншыя хаваліся на Беларусі і ў драўлянскай зямлі, або Палессі. Знатнейшыя роды з малалікімі княжымі сем'ямі адышлі ў суседняе Княства Літоўскае, і там знаходзячыся, многія злучыліся сваяцтвам з уладарнымі і вяльможніцкімі родамі тамтэйшымі. З дапамогай гэтага схілілі ўладарнага літоўскага князя Гедзіміна вызваліць іх зямлю ад татарскага іга і злучыць яе з сваёй дзяржавай пад адным правам і кіраваннем".

Цалкам слушна Георгій Каніскі падкрэсліў выключную ролю продкаў беларусаў і вялікага князя Гедзіміна, якія спрычыніліся да вызвалення ўкраінскіх земляў ад татарскага нашэсця. Ён пісаў: "Таму князь Гезімін ў 1320 годзе, прыйшоўшы ў межы Маларасійскія з войскам сваім літоўскім, злучаным з рускім, якімі кіравалі рускія ваяводы Пранцэслаў, Светольд і Блуд, ды палкоўнікі Громвала, Турніла, Перунада, Ладзіма і іншыя, выгналі з Маларосіі татар, перамогшы іх у трох бітвах, і на апошняй галоўнай на рацэ Ірпень, дзе былі забітыя Тымур і Дыўлет, князі татарскія, прынцы ханскія. За гэтымі перамогамі ўзнавіў Гедзімін праўленне рускае пад начальствам выбраных ад народа асобаў, а над імі зладзіў намеснікам сваім з рускай пароды князя Гальшанскага, пасля каторага былі з гэтай жа пароды многіе іншыя намеснікі і ваяводы. Але знатнейшы з іх вядомы Сімяон Аляксандравіч, ваявода і князь Кіеўскі і Слуцкі, які ўзнавіў у 1470 годзе цэрквы і манастыры Кіеўскія, Батыем спустошаныя і больш за два стагоддзі апусцелыя. Правы ж і звычаі рускія ня толькі пацвердзіў Гедзімін тамтэйшаму народу ва ўсёй іх прасторы, але ўвёў іх і ў сваёй зямлі разам з пісьмёнамі або граматай Рускай. Таму і дагэтуль ў Княстве Літоўскім бачныя ў старажытных архівах і ў прыватных асоб старыя прывілеі і іншыя дакументы, пісаныя рускім пісьмом, а карэннае права рускае, вядомае пад імем судных артыкулаў і сабранае ў адну кнігу, Статут званую, перакладзена пасля з рускай мовы на польскую, што і ў самой той кнізе пры канцы надрукавана".

Такім чынам, гістарычная канцэпцыя Георгія Каніскага заснавана на ўсебаковым аналізе вялікай колькасці пісьмовых крыніц і глыбокім веданні фактычнага матэрыялу, што давала яму падставы рабіць аб'ектыўныя і навуковыя высновы, а таксама з павагай ставіцца да кожнага з трох усходнеславянскіх народаў.

Георгій Каніскі – выдатны мысліцель і інтэлектуал свайго часу. Яго пяру належыць капітальная праца пад назвай: "Маральная філасофія, або Этыка" (1747), якая не страціла навуковай значнасці і актуальнасці ў наш час. Вучоны справядліва лічыў этыку ўніверсальнай навукай. Паводле яго меркавання, яна з'яўлялася асновай паводзінаў чалавека ў сям'і і ў грамадстве, а таксама ўтварала надзейны падмурак для эканомікі і палітыкі (1, с. 422). Місія этыкі як навукі, – лічыў ён, – навучаць людзей добрым норавам, адводзіць ад злых учынкаў (1, с. 423). У кнізе інтэлектуал распрацаваў сістэму агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей і зрабіў шэраг практычных рэкамендацый, якія з'яўляюцца стрыжнем функцыянавання і сучасных грамадстваў.

Выдатны інтэлектуал XVIII ст. стварыў бліскучы філасофскі курс: "Агульная філасофія, падзеленая на чатыры аддзелы, якая змяшчае логіку, фізіку, метафізіку і этыку" (1749). Георгій Каніскі сінтэзаваў лепшыя здабыткі еўрапейскай навуковай думкі, адаптаваў іх да ўсходнеславянскіх традыцый. Філасаф палемізуе з прадстаўнікамі тамізму, якія лічылі, што першаматэрыя не можа існаваць без формы. Паводле меркавання Георгія Каніскага, першаматэрыя ўсіх рэчаў – агульная і нязменная. Усе рэчы адрозніваюцца між сабой формай, а не матэрыяй (2, с.151). Дзеля падмацавання ўласных тэзісаў і высноў, Георгій Каніскі выкарыстоўваў прыклады з жыцця грамадстваў, назіранні над прыроднымі з'явамі, а таксама паводзінамі жывёл і птушак. Твор напісаны бліскучым літаратурным стылем, з выкарыстаннем разнастайных эпітэтаў і яркіх параўнанняў.

Такім чынам, вялікая пісьмовая спадчына Георгія Каніскага – каштоўны інтэлектуальны рэсурс, скарбніца інтэграцыйных ідэй, трывалы грунт паразумення паміж брацкімі ўсходнеславянскімі народамі і краінамі Еўропы.

## Літаратура і крыніцы:

1. Конисский, Г. Нравственная философия, или Этика / Г. Конисский // Памятники этической мысли на Украине XVII – первой половины XVIII в. – Киев : Навукова думка, 1987. – С. 419–522.

2. Конисский, Г. Общая философия, разделенная на четыре отдела, содержащая логику, физику, метафизику и этику / Г. Конисский // Кашуба, М.В. Георгий Конисский / М.В. Кашуба. – Москва : Мысль, 1979. – С. 143–167.

3. Памятники литературы Беларуси X–XVIII вв. / Составление, вступительная статья, литературная обработка текста, перевод на русский язык И.В. Саверченко. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2013. – С. 438–441.